**УДК [72 8.83 + 712](476.7)(091)**

# МАЁНТАК МАГІЛЁЎЦЫ ПАМЕШЧЫКАЎ ДЗЯКОНСКІХ У 1880 – 1930-Я ГАДЫ

***канд. гіст. навук В.М. ПАПКО***
***(Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт)***

*Артыкул прысвечаны гісторыі маёнтка Магілёўцы, які знаходзіўся ў Ваўкавыскім павеце (зараз Пружанскі раён Брэсцкай вобласці). Доўгі час маёнтак належаў роду Быхаўцаў. У канцы 70-х – пачатку 80-х гадоў XIX стагоддзя пасля смерці бяздзетных братоў Быхаўцаў Магілёўцы перайшлі да сына іх сястры Казіміра Дзяконскага. На аснове ненадрукаваных мемуараў Ц. Цішэўскай аналізуецца стыль жыцця гаспадароў маёнтка. Прапанавана апісанне маёнтка, які быў цэнтрам свецкага жыцця рэгіёну. У артыкуле расказваецца аб лёсах апошніх гаспадароў маёнтка – Стэфаніі і Альбіна-Міхала Дзяконскіх. У навуковы зварот уведзены новыя дакументы, якія захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна і Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы. Упершыню друкуюцца фотаздымкі, прадстаўленыя нашчадкамі Дзяконскіх.*

**Уводзіны.** Значная частка былых шляхецкіх сядзіб на тэрыторыі Беларусі была знішчана падчас войнаў. Некаторыя з будынкаў, што захаваліся, пакінуты без гаспадарскага нагляду і паступова пераўтвараюцца ў руіны. Зусім невялікая колькасць сядзіб у наш час выкарыстоўваецца для нейкіх патрэб грамадства. На тэрыторыі Брэсцкай вобласці такіх прыкладаў нямнога, да іх адносіцца былая сядзіба ў Магілёўцах (Пружанскі раён), дзе месціцца Брэсцкая абласная псіхіятрычная бальніца.

Лёс сядзібы ў Магілёўцах і лёсы яе гаспадароў – цікавыя старонкі ў гісторыі Пружаншчыны. Многія стагоддзі Магілёўцы знаходзіліся ва ўладанні знакамітага роду Быхаўцаў.

**Гаспадаранне Казіміра Дзяконскага.** У 1878 годзе маёнтак належаў двум братам – Сяргею Аляксандравічу і Казіміру Аляксандравічу Быхаўцам, абодва былі генерал-маёрамі расійскага войска. На той час маёнтак уваходзіў у склад Ваўкавыскага павета, размяшчаўся на мяжы Слонімскага і Пружанскага паветаў, налічваў 3 тыс. 607 дзес. зямлі. Сярэдні валавы даход з маёнтка складаў каля 6 тыс. 650 руб. срэбрам [1, арк. 19 – 21 адв.].

Пасля смерці братоў-генералаў, у якіх не было дзяцей, маёнтак дастаўся сыну іх сястры Юліі, Казіміру Дзяконскаму. Юлія (1825 – 1858) была жонкай Яўстафія Дзяконскага (1820 – 1894). Яна памерла вельмі маладой і была пахавана на каталіцкіх могілках у Сапоцкіне (Гродзенскі раён).

Дату нараджэння Казіміра высветліць не атрымалася. Відаць, ён быў зусім малы, калі памерла яго маці. Казімір атрымаў дыплом урача ў Дорпацкім універсітэце, хаця ніколі не практыкаваў. Яго жонкай стала Стэфанія Талочка, дачка Эдварда Талочкі – гаспадара маёнтка Вердамічы Ваўкавыскага павета (зараз вёска ў Свіслацкім раёне Гродзенскай вобласці).

З Талочкамі Казімір пазнаёміўся выпадкова. У гэтай сям'і быў адзіны сын Юліян і тры дачкі: Стэфанія, Ядвіга і Леанціна. Самая малодшая з сясцёр, Леанціна (Лілі), увесь час хварэла. У доме Талочкаў часта адбываліся медыцынскія кансіліумы, аднак дактары нічым не маглі дапамагчы. Аднойчы суседка Талочкаў, гаспадыня маёнтка Зеляневічы, Ядвіга Сегень, прапанавала запрасіць на такі кансіліум Казіміра Дзяконскага. Так, дзякуючы сваёй адукацыі ўрача, ён упершыню трапіў у Вердамічы, а потым ажаніўся з адной з сясцёр, Стэфаніяй.

Родная пляменніца Стэфаніі, дачка яе брата Юліяна, Цэцылія Цішэўская з Талочкаў пакінула пасля сябе рукапіс мемуараў. У гэтых успамінах яна шмат пісала пра сям'ю Дзяконскіх. «Ніколі не ведала падобнай закаханай адно ў адно, зладжанай сямейнай пары, на працягу цэлага жыцця не было ніводнай спрэчкі, хоць гэта быў агонь і вада, а можа менавіта таму... Цёця была надзвычайна жывой, дзядзька – увасабленне спакою. Ён быў вельмі мілы, выхаваны, але негаворкі. Калі цёця кідалася не раз да яго з праяўленнем пачуццяў і пацалункамі, ён са сваёй прыемнай, добрай усмешкай рабіў выгляд, што адганяе і хацеў "чуласці на лістапад". Мы, дзеці, вельмі любілі яго, і ён нас, усе забавы, маёўкі і г. д. былі пад яго патранатам» [2, арк. 25].

Усё жыццё гэтай сям'і было звязана з Магілёўцамі. Вялікі сядзібны будынак захаваўся да нашых дзён. На думку польскага даследчыка Р. Афтаназы, аднапавярховы дом быў пабудаваны ў сярэдзіне XVIII стагоддзя Быхаўцамі, а прыблізна праз 100 гадоў значна павялічаны за кошт дабудовы бакавых крылаў. Парадны ўваход з порцікам падтрымлівалі чатыры іанічныя калоны. З кожнага боку ад порціка было па 9 вокнаў, атынкаваныя сцены былі пафарбаваны ў белы колер. Унутраны інтэр'ер дома фарміраваўся на працягу некалькі дзесяцігоддзяў, у ім адлюстраваліся розныя эпохі і стылі. У цэнтры музычнага салона стаяў раяль фірмы Бехштэйн. Мэбля ў гэтым пакоі была аздоблена бронзай. Следам за музычным салонам ішоў квадратны пакой, які на дзве часткі падзялялі дзве калоны і дзве паўкалоны. Гаспадары на-

зывалі гэты пакой «філаровым» (калонным). Пярэдняя яго частка – салон, абстаўлены мэбляй у стылі ампір, пакрытай зялёным матэрыялам. Тыльная частка была спальняй, дзе стаялі два вялікія ложкі. На другім паверсе былі толькі два вялікія пакоі, дзе падчас палявання спалі мужчыны [3, с. 266 – 269; 4, с. 164 – 165].

Аднавіць тагачасны выгляд дома дапамагаюць успаміны Ц. Цішэўскай. Любімым пакоем гаспадароў была вялізная бібліятэка, уздоўж сцен якой ішлі шафы з карэльскай бярозы. Бібліятэка Дзяконскіх, якая, так сама як і ўвесь маёнтак, раней належала роду памешчыкаў Быхаўцаў, была адной з самых багатых і знакамітых у ваколіцах, славілася калекцыяй старажытных рукапісаў. Некалі тут захоўвалася знакамітая хроніка Быхаўца. У сярэдзіне бібліятэкі стаяў вялікі стол з газетамі і часопісамі, які абкружала круглая канапа, разлічаная на 20 асоб. Каля гэтага стала часта сядзеў гаспадар маёнтка, Казімір Дзяконскі. Любімае крэсла і столік гаспадыні стаяў у нішы каля аднаго з трох вокнаў, дзе яна часта сядзела з працай.

Згодна з традыцыямі тых часоў, нават вельмі знатныя і багатыя жанчыны займаліся шыццём і вышыўкай. Стэфанія Дзяконская сама вышыла арнаты для капліцы, якую было відаць з вокнаў бібліятэкі. Пакой асвятлялі тры жырандолі з каляровага венскага шкла, якія віселі ў аконных нішах. З бібліятэкі дзверы выходзілі ў малы салонік, абстаўлены мэбляй, пакрытай чорным кітайскім лакам. Пакой гэты амаль не выкарыстоўваўся. Дом у Магілёўцах быў пабудаваны па прынцыпу анфілады. З тылу дома знаходзіўся вялікі більярдны пакой, з цягам часу замест сярэдняга акна паставілі дзверы, праз якія блізка было ісці да капліцы. За гэтым пакоем размяшчалася сталовая зала, дзе стаялі шкляныя шафы, у якіх быў выстаўлены посуд з саксонскай парцэляны, разлічаны хіба на 100 асоб. Далей былі іншыя пакоі – канцылярыя гаспадара, скарбніца з жалезнымі дзвярыма і г. д.

Са сталовай можна было трапіць на веранду, другі пасля бібліятэкі любімы пакой гаспадароў. Адтуль сходы вялі да невялікага кавалачка саду, абгароджанага невысокім мурам. У гэтым куточку квітнелі геліятропы, пеларгоніі і бегоніі, сярод якіх стаялі лаўкі і можна было адпачыць. Большая частка парку называлася звярынцам і мела характар даволі дзікі. Аднак была і частка з клумбамі, кветкамі, вялікім ставам, садам і агародам.

«Гэта быў адзін з нешматлікіх маёнткаў, цалкам эканамічна незалежны. Акрамя гарбаты, кавы, цукру, разынак і віна (таму што… не было склепа), не трэба было нічога набываць, а кухня, якой апекаваўся кухар Уладзіслаў, была першакласнай. Было мноства дзічыны, дзікіх і хатніх птушак, былі таксама бараны, цяляты, свінні, рыба, грыбы, садавіна, уласныя сыры, вялізныя, як кола млына, мёд, адным словам, усяго хапала, а малака, смятаны, масла і вяндліны было шмат. Усім маёнткам кіравала, уласна кажучы, цёця Стэфця, жанчына невычарпальнай энергіі і незвычайнага розуму» [2, арк. 24 – 25].

Вядзенне гаспадаркі ў Магілёўцах ажыццяўлялася традыцыйным чынам і было вельмі падобнае на іншыя маёнткі. Частка фальваркаў здавалася ў арэнду, што было звычайнай практыкай. У сакавіку 1889 года паміж сабой судзіліся два арандатары фальваркаў і ўрочышчаў Гута, Разалін, Копань, Лібертполь, Янін, Рагодзіца, Дубовіца, Сямёнаў Груд і інш. Мешчанін Калікст Іванавіч Варановіч абвінавачваў памешчыка Іпаліта Паўлавіча Стралецкага ў тым, што той самавольна ставіў замкі на будынкі, якія яны арандавалі разам [5, арк. 1].

Акрамя грашовых падаткаў, якія плаціў уладальнік маёнтка, былі і натуральныя падаткі. Да такіх адносіўся рамонт мастоў і гацяў, якія знаходзіліся на ваенна-камунікацыйных, паштовых і гандлёвых дарогах. Казімір Дзяконскі быў абавязаны пастаўляць будаўнічы матэрыял для рамонту моста, які знаходзіўся на дарозе з Ваўкавыска ў Ружаны [6, арк. 1].

У фальварку Разалін знаходзілася прадпрыемства па вытворчасці спірту. Разалінскі вінакурны завод Казіміра Дзяконскага насіў нумар 12. Будынак быў каменны, двухпавярховы. За чатыры сажні ад завода знаходзіўся каменны падвал. Завод меў паравую сістэму Пісторыуса. Ён дзейнічаў ужо ў 1891 годзе, упраўляючым тады быў шляхціц М.І. Здрайкоўскі (да 1895 г.). К. Дзяконскі выбіраў на пасаду ўпраўляючых выключна дваран [7, арк. 1 – 128].

Стыль жыцця сям'і Дзяконскіх быў тыповым для заможнай шляхты на гэтых землях. Напярэдадні першай сусветнай вайны маёнтак у Магілёўцах быў цэнтрам мясцовага свецкага жыцця. Музычныя захапленні гэтай сям'і прыцягвалі на вечары шмат родзічаў і знаёмых. Гаспадар дома іграў на скрыпцы, фартэпіяна і аргане. Яго жонка Стэфанія была цудоўнай піяністкай. Дух шляхецкай культуры, нажаль, слаба перадаюць гаспадарчыя дакументы і метрычныя запісы. Мемуары Ц. Цішэўскай дазваляюць уявіць сабе расклад звычайнага дня гаспадыні маёнтка Магілёўцы, які тая ведала дасканала: «Яна (Стэфанія) уставала заўсёды ў 5 гадзін раніцы, у халаце і з распушчанымі валасамі сядала ў сваёй канцылярыі, каля бібліятэкі. Там, палячы адную папяросу за другой, прымала наведвальнікаў: упраўляючага, садоўніка, рымара, карэтніка і інш. Потым пісала доўгія, як сажань, дзелавыя і прыватныя лісты.

Каля восьмай гадзіны ішла ў так званы шафавы пакой, дзе мела шчодрае заслужанае сняданне і падчас гэтага давала распараджэнні на цэлы дзень кухару і яго жонцы Манечцы, якая была служанкай і адначасова аптэкаркай. Другой служанкай была маладая дзяўчына Гэлечка. Пасля чаго цёця рабіла ра-

нішні туалет, апранала спадніцу і так званую мацінку, з высокім “tour de coup”* з шаўковай стужкі, з якой таксама былі зроблены рознакаляровыя шалі ў пасе. Не разумею, як у гэтым можна было вытрымліваць у спякоту. І да паўдня яна была гатова бавіць гасцей, альбо да іншых хатніх заняткаў. Госці, калі былі, сыходзіліся каля дзевяці ў сталовай да шчодра застаўленага стала. Дамы ў такіх самых выкарункаваных мацінках, толькі мая мама з раніцы была ў англійскай блузцы з цвёрдым накрахмаленым каўнерам, з гальштучкам і ў гарсэце, які іншыя дамы накладалі толькі перад абедам. Гэта была страшная прылада мучэння, з грубага палатна, поўнага кітовага вуса, наперадзе зашпільвалася на брыклі, на спіне была шнуроўка, якой служанка зацягвала гарсэт, пакуль дых не займала. Перад абедам, які быў у гадзіну, усе дамы прыбіраліся і накладвалі гарсэты.

Абеды і вячэры мелі заўсёды той самы стыль: ці дзядзька з цёткай былі самі, ці былі госці. Ніколі нічога не змянялася, толькі Уладзіслаў ведаў, што, калі хтосьці заехаў, усяго павінна быць больш, але таго самага, а запасы ў той гаспадарцы цёці былі вялізныя, так што не было клопату. Слугі былі так выдрэсіраваны, што цёця не павінна была рушыць з крэсла. Я любіла з цёцяй хадзіць у аранжарэю, поўную кветак, выбіраць, якія з іх прынесці да дому. Альбо хадзілі да гаспадаркі – свойскай птушкі і свіней. Ездзілі мы таксама часта па грыбы ў лес, размешчаны каля фальварка Разалін, дзе ў прасторным ладным доміку жыў упраўляючы Елінэк, які бадай што цэлае жыццё быў у цёці з дзядзем. Па грыбы ездзілі дзіўнай старасвецкай павозкай, якую называлі амвонкай, крытай гранатавым сукном. Сядзенні былі не папярочныя, як у кожнай брычцы, а ішлі так, як дышаль; папросту людзі сядзелі бокам да каня, сядзенні былі ўзняты, і туды, у вялікія паглыбленні, складвалі кашы з грыбамі» [2, арк. 23 – 25].

Стэфанія Талочка актыўна займалася грамадскай дзейнасцю. У значнай ступені дзякуючы яе старанням у Лыскаве быў пабудаваны невялікі каталіцкі касцёл. Справа ў тым, што прыгожы касцёл місіянераў у 1866 годзе быў ператвораны ў праваслаўную царкву [8, с. 362]. Каля гэтага будынка знаходзілася занядбаная магіла вядомага польскага паэта Ф. Карпінскага. Стэфанія Дзяконская планавала перанесці астанкі паэта ў іншае месца, збірала на гэта грошы, звярталася па дапамогу да Г. Сянкевіча, Э. Ажэшкі і родзічаў паэта, якія жылі ў Амерыцы [9, с. 4].

Восенню 1913 года адбылося шмат сумных падзей у сем’ях Талочкаў і Дзяконскіх. Спачатку пасля некалькіх тыдняў хваробы памерла маці Стэфаніі Дзяконскай, бабуля Цэцыліі. Аднак Стэфанія нават не змагла трапіць на яе пахаванне, таму што ў гэты час паміраў яе муж. Сведка гэтых падзей, Цішэўская, падрабязна апісвае апошнія дні жыцця Казіміра Дзяконскага: «Мы (з кузенам Эдзем Тарасовічам) засталі цёцю вельмі прыгнечанай болем. Яна моцна ўзрадавалася нашаму прыезду. Дзядзька ляжаў вельмі зменены, але таксама нам вельмі ўзрадаваўся. Штодзень яму было горш, але гэта працягвалася пару тыдняў. Мясцовая салідарнасць: дом быў поўны сваякоў і сяброў. Цёця і дзядзька аточаны апекай сяброў, цётцы дапамагалі ва ўсім, слугі на пальцах хадзілі, у вочы глядзелі, а ў саміх слёзы ў вачах, таму што дзядзьку вельмі любілі.

Кс. Сялевіч пераехаў у Магілёўцы і толькі раз на пару дзён ехаў раніцай у Лыскава са святой імшой, у іншыя дні праводзіў св. імшу ў капліцы, дзе знаходзіўся Найсвяцейшы Сакрамент і Святы Алей… І ўсе мы чакалі ў напружанні гэтай жудаснай, апошняй хвіліны. Ніхто не меў адвагі сказаць дзядзьке, што трэба падрыхтавацца да гэтай апошняй дарогі... 30 кастрычніка 1913 года ў у тры гадзіны ночы Дзядзя заплюшчыў вочы навякі...

Цётка з сухімі, палымнеючымі вачыма сядзела ў бібліятэцы ў сваім крэсле... Абняўшы мяне за шыю, яна заснула на некалькі гадзін. Я сядзела на каленях, не смеючы абудзіць цётку, бо тая два тыдні не была ў ложку. Кожны з прыезджых узяў на сябе якія-небудзь справы, так што цёця ні пра што не павінна была думаць. Прыехала цёця Альбінава з сынам Альбінам (Бінусем), брат дзядзькі, Юліян, а на само пахаванне толпы суседзяў, сваякоў, сяброў… Пахавальная імша была яшчэ ў вазоўні, таму што касцёл, хоць ужо накрыты дахам, не быў закончаны. Труну на плячах неслі канторшчыкі, слугі, сям’я, суседзі і паклалі за касцёлам (з тыльнага боку), а потым там жа была пахавана і цётка» [2, арк. 254].

**Падзел спадчыны Казіміра Дзяконскага.** Сітуацыя са спадчынай Казіміра была не вельмі простай. З матэрыялаў судовай справы аб выкананні завяшчання вынікае, што Казімір Дзяконскі пакінуў сваю спадчыну жонцы Стэфаніі, «за выключэннем родавай нерухомай маёмасці». Аднак доля Стэфаніі складала толькі 1/7 частку маёнтка Магілёўцы. Усё астатняе павінна было трапіць у рукі малодшага брата Казіміра, Юліяна Дзяконскага. Стэфаніі пакідалася права пажыццёва валодаць гэтай родавай маёмасцю. Завяшчанне было складзена Дзяконскім у красавіку 1909 года ў віленскага натарыуса А. Лютцэ. Адным са сведкаў пры зацвярджэнні завяшчання быў віленскі адвакат Максіміліян Мамертавіч Малінскі [10, арк. 1 – 2].

Верагодна, Казімір не хацеў, каб маёнткам валодаў яго брат, немалады ўжо чалавек, у якога таксама не было дзяцей. Таму за некалькі гадоў да смерці Казімір зрабіў некаторыя захады, каб пазбегнуць страты маёнтка. У 1909 годзе Стэфанія пазычыла мужу 126 тыс. руб. пад заклад маёнтка Магілёўцы. Нам

* Від каўнера.

падаецца, што гэта было мерай забеспячэння яе больш трывалага матэрыяльнага становішча ў выпадку смерці мужа. Да таго ж Казімір меў грашовыя прэтэнзіі да брата Юліяна на суму звыш 100 тыс. руб. Перад смерцю Казімір дамовіўся аб продажы фальваркаў Гута, Янін, Лібертполь і ўрочышча Патароча плошчай 1910,56 дзес. зямлі з Вільгельмам Ельскім. Нягледзячы на тое, што купчая афармлена не была, Стэфанія вырашыла выканаць волю мужа і давесці гэтую справу да канца.

Аднак галоўным планам, які прыйшоў у галаву бяздзетным супругам, было ўсынаўленне сына далёкіх родзічаў – Альбіна і Ядвігі Дзяконскіх – Альбіна-Міхала (1892 – 1940). Адразу пасля смерці Казіміра Дзяконскага яго жонка Стэфанія пачала ўладкоўваць спадчынныя справы такім чынам, каб захаваць свае інтарэсы і забяспечыць маёмасць Альбіну. У снежні 1913 года было складзена пагадненне паміж Стэфаніяй, Альбінам і яго бацькамі. Нажаль, атрымалася знайсці толькі непадпісаны варыянт, таму не вядома, ці меў ён законную сілу. Між іншым гэты дакумент можна ўмоўна назваць «дагаворам аб намерах». Пагадненне абвяшчала згоду ўсіх бакоў на імкненне перадаць Альбіну маёнтак Магілёўцы, а Стэфаніі пры гэтым быў забяспечаны грашовы штогадовы даход і пражыванне ў доме. Размова ішла нават пра тое, што Альбін купіць у яе 1/7 частку маёнтка [11, арк. 1 – 2]. Аднак першапачатковай задачай было ўстанаўленне дамоўленасці з галоўным нашчадкам, Юліянам.

Юліян Дзяконскі жыў у Сувалках і займаўся нейкай камерцыйнай дзейнасцю. Па ўсім відаць, што справы яго ішлі добра. Юліян згадзіўся прадаць частку спадчыны брата за 45 тыс. руб. Хутка пасля гэтага, ў снежні 1913 года, Юліян склаў сваё асабістае завяшчанне. Сваіх дзяцей у яго не было, жонка Разалія з Грыгаровічаў памерла. Усю сваю рухомую маёмасць Юліян завяшчаў Сігізмунду Антонавічу Буйноўскаму, жыхару г. Сувалкі, якога ён успрымаў як свайго прыёмнага сына. Буйноўскі быў сынам бліжэйшых суседзяў Дзяконскага, вырас на яго вачах. Юліян дапамог яму адчыніць сваю лаўку і вёў з ім нейкія агульныя справы.

Між іншым, паводле дадзеных на сакавік 1914 года, маёнтак Магілёўцы быў даволі значным зямельным уладаннем, да яго належалі фальваркі Разалін, Янін, Лібертполь, Гута і хутары Копань, Полька, Сосенкі і Крупа. Агулам маёнтак Магілёўцы з фальваркамі і хутарамі складаў 5 тыс. 81 дзес. зямлі, з іх 3 тыс. 607 дзес. зручнай і 1 тыс. 474 дзес. нязручнай [12, арк. 1].

12 мая 1914 года ў Вільна быў складзены раздзельны акт на спадчыну Казіміра Дзяконскага. Аднак вельмі хутка, 29 чэрвеня 1914 года, Юліян Дзяконскі памёр. Буйноўскі патрабаваў выплаціць яму грошы, абяцаныя Юліяну за Магілёўцы. Стэфанія Дзяконская была вымушана закласці маёнтак, каб разлічыцца, што і было зроблена да канца 1914 года [13, арк. 1 – 18].

Спадчынныя справы і першая сусветная вайна сталі прычынамі паступовага заняпаду маёнтка. Падчас вайны пачасціліся факты грабяжу, сяляне вялі сябе нахабна, разумеючы, што ўладам не да таго, а пазіцыі памешчыкаў аслабелі: многія мужчыны пайшлі на фронт, гаспадаркай займаліся жанчыны. У жніўні 1914 года аканом маёнтка Магілёўцы Аляксандр Елінк паведаміў прыставу Ваўкавыскага павета, што сяляне вёскі Гута браты Антон і Лявонцій Чайкоўскія самавольна лавілі рыбу на тэрыторыі маёнтка. А калі ляснічы Іван Стасевіч іх убачыў і патрабаваў спыніць лоўлю, яны яго пабілі і пагражалі, «што яшчэ не так будзе», і матывавалі свой учынак ваенным часам. Адбылося разбіральніцтва, але хутчэй за ўсё вінаватыя не былі пакараны, сапраўды, было не да таго: вайна набірала свае абароты [14, арк. 1].

Перамяшчэнне войска прыносілі сельскай гаспадарцы значны ўрон, гэта былі патравы злакавых і рэквізіцыі. У верасні 1915 года ў маёнтку Магілёўцы рэквізіцыю жыта, аўса, пшаніцы, канюшыны, вікі, саломы і бульбы праводзіў маршалак шляхты Гродзенскага павета, аб чым выдаў квітанцыю на 120 тыс. 610 руб. прадстаўніку Дзяконскай, яе брату Юліяну Эдуардавічу Талочку [15, арк. 1 – 2].

У гэты час Альбін знаходзіўся ў апалчэнні расійскай арміі, а Стэфанія пераехала ў глыб Расійскай імперыі. У лютым 1916 года ў арлоўскага натарыуса Стэфанія аформіла на Альбіна даверанасць на права прадстаўляць яе інтарэсы ў справе кампенсацыі страт, панесеных у маёнтку Магілёўцы ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі [16, арк. 1 – 1 адв.]. У 1920 годзе былі зроблены падлікі гэтых страт ад рускіх і нямецкіх войск. Верагодна, кампенсаваць маглі толькі тое, што было занатавана на паперы. Рэквізіцыя прадуктаў на суму 120 тыс. 610 руб. на патрэбы рускага войска склала 8 % ад перадваеннага кошту маёнтка (1,5 млн. руб.). Рускія ўлады кампенсавалі Стэфаніі 104 тыс. 410 руб. Страты ад дзеянняў немцаў склалі 9 % ад кошту маёнтка, або 161 тыс. 49 руб., яны нікім не кампенсаваліся. З дакументаў відаць, як значна ад немцаў у 1915 – 1918 гадах пацярпеў дом Дзяконскіх і прыватныя рэчы гаспадароў. У спісе забраных немцамі прадметаў значыцца вопратка, абутак, коўдры, залатыя ўпрыгожанні, калье з манет. Немцы рэквізавалі мэблю з кабінета і сталовай – шафу, камод, столікі, аб чым упраўляючаму былі выдадзены даведкі [17, арк. 1 – 8].

Некаторы час Альбін служыў пры штабе нейкай вайсковай часткі ў Арле, куды да яго прыехала нявеста Соф'я Малінская і Стэфанія Дзяконская. Прыёмная маці падштурхоўвала маладых людзей да шлюбу. Вянчанне адбылося 11 мая 1917 года, у дзень нараджэння Альбіна, у Арлоўскім рымска-каталіцкім прыхадскім касцёле [18, арк. 1].

**Маёнтак Магілёўцы ў 1918 – 1939 гадах. Альбін-Міхал Дзяконскі.** Пасля вайны Альбін з жонкай і Стэфанія вярнуліся ў Магілёўцы, дзе быў разгромлены маёнтак. Відаць, адносіны паміж Цішэўскай і гэтай сям'ёй пагоршыліся пасля першай сусветнай вайны, што вынікае з некаторых намёкаў у мемуарах. Пасля смерці Стэфаніі яна болей не ўзгадвае нікога з гэтага роду. Апошнія ўспаміны Цішэўскай пра Магілёўцы: «У Магілёўцах былі мы некалькі дзён, але гэта ўжо былі не тыя самыя Магілёўцы. Цёця Стэфця ёсць, новай гаспадыняй дома з'яўляецца Зося Бінусева, з роду Малінскіх. Зося цудоўная і мілая, зразумела, што стыль дома іншы, чым перад вайной, настолькі, што… дом стаіць, але знішчаны, абрабаваны. Няма ўжо таго былога настрою дома, які пакаленнямі не змяняўся. Няма следу саксонскай парцэляны, карэльская бяроза знішчана, парк занядбаны, вайна заўважаецца ў кожнай дробязі» [2, арк. 244].

Каб аднавіць Магілёўцы, Альбін-Міхал у 1923 годзе прадаў маёнтак Каралін у Кобрынскім павеце, які яму дастаўся ў спадчыну ад яго роднага бацькі Альбіна Дзяконскага (1838 – 1918) [19, арк. 18]. Вельмі хутка, 13 верасня 1924 года, памерла Стэфанія Дзяконская, пакінуўшы ўсю сваю спадчыну Альбіну-Міхалу. Праз тыдзень яна была пахавана побач з мужам на могілках каля касцёла Сэрца Хрыстова ў Лыскаве [20, арк. 1]. З 1924 года Альбін стаў паўнапраўным гаспадаром маёнтка. Гэтая падзея супала з пачаткам даволі шырокай аграрнай рэформы, якая праводзілася ў Польшчы і датычылася памешчыцкіх уладанняў. Не захавалася дакументаў аб правядзенні аграрнай рэформы ў гэтым маёнтку. Вядома толькі, што існавалі планы парцэляцыі фальваркаў Гута, Янін, Лібертполь і ўрочышча Патароча ад 1926 года [21, арк. 1].

У 1922 годзе Альбін Дзяконскі як гаспадар маёнтка Магілёўцы па колькасці зямлі займаў 427 месца ў рэйтынгу 500 найбольш заможных памешчыкаў Польшчы [22, с. 356 – 376]. Гэта быў самы вялікі маёнтак з уладанняў, якія належалі прадстаўнікам роду Дзяконскіх. У 1930 годзе маёнтак Магілёўцы налічваў 3 тыс. 300 дзес. зямлі [23, с. 7]. Вёска Магілёўцы ў 1920 – 30-я гады пры пане Альбіне налічвала 559 жыхароў і некалькі маленькіх прадпрыемстваў: цагельны завод, па дзве сталярныя, кавальскія і цясьлярскія майстэрні, тры кравецкія майстэрні, водны млын. Даходы з маёнтка былі даволі значнымі. У Магілёўцах Альбін меў машыну маркі «Адлер», што на гэтых землях у той час было вялікай рэдкасцю [24, с. 10].

Сядзібу ў Магілёўцах, у якой Альбін пасяліўся ў 1913 годзе, у адным са сваіх вершаў ён назваў «домам, падобным на паром». Некаторыя свае ўражанні ад дома, навакольнай прыроды Альбін адлюстроўваў у сваіх вершах. Прыгожы парк у Магілёўцах вельмі падабаўся яго гаспадару, аднак і выклікаў трывожныя пачуцці. У вершы «Шкляны парк» Дзяконскі піша: «Баюся свайго парку, неба ў парку – са шкла». Верш перадае панічны настрой Альбіна напярэдадні другой сусветнай вайны. Ён пісаў верш, яшчэ не ведаючы, што хутка яго ўтульны свет згіне, пахаваны пад абломкамі польскай дзяржавы.

Два невялікія вершы прысвечаны капліцы, якая знаходзілася каля панскага дома.

З ліственіцы капліца,
кажуць, старэйшая за дом,
але хто дом будаваў,
дом падобны на паром?
Вячэрнім пахне брызам
шырокі разліў ракі –
у мгле бачу гарызонт
і бераг мой недалёкі.

Дом у Магілёўцах быў прыстанішчам, якое паэт любіў, аднак і адчуваў сябе яго вязнем. Менавіта тут нарадзілася большасць вершаў Дзяконскага.

***Ланцуг пакояў***
(крокі – крокі)
туды і назад
50 перамен
ад святла да мроку
(чорны бляск вокнаў
у праёмах сцен)
50 крокаў туды
і назад
дарогі накладваю
жыццё адкладваю
напотым
напотым
напотым.*

* Пераклад з польскай мовы В.М. Папко.

Гаспадаркай Альбін займаўся неахвотна, шмат часу аддаваў паэтычнай творчасці. Першая кніга «Байкі» пабачыла свет яшчэ ў 1920 годзе. Гэта быў невялікі зборнік вершаваных баек, сярод якіх: «Шпак», «Алень», «Ліс і барсук», «Ваявода», што часам складаліся ўсяго з некалькіх радкоў. На працягу 1920 – 30-х гадоў выходзяць наступныя тамы паэзіі Дзяконскага: «Байкі. Сатыры. Лірыка» (1926), «Элегія» (1929), «Эклогі» (1931), «Матывы з горада» (1931), «На захад» (1932), «Два галасы» (1933), «Драма Люцыфера» (1934), «Падгледжаныя рэчы» (1936) і інш. Апошняя кніга «Зялёныя Магілёўцы» пабачыла свет у 1939 годзе напярэдадні другой сусветнай вайны. Кнігі свае Дзяконскі выдаваў невялікім тыражом. Яго даходы дазвалялі яму друкаваць творы, аднак ён асэнсавана не ішоў на шырокую папулярызацыю сваіх вершаў [25, с. 12 – 14].

Спакойнае жыццё ў правінцыйных Магілёўцах, поўнае клопатаў аб гаспадарцы і паэтычнай творчасці, было раптоўна перарвана ў верасні 1939 года. Пасля таго як Чырвоная армія заняла тэрыторыю Заходняй Беларусі, А. Дзяконскі быў арыштаваны разам з войтам лыскаўскай гміны Станіславам Вічфінскім, які быў яго сябрам і таксама жыў у маёнтку [26, с. 3]. Пасля арышту Дзяконскага ўтрымлівалі ў Мінску. Вядома, што ў сакавіку 1940 года ён яшчэ быў жывы, далейшы лёс яго не вядомы.

В. Церахава ў сваіх артыкулах прыводзіць успаміны старых людзей і чуткі пра лёс А. Дзяконскага пасля арышту. А.Л. Канькоўская ўспаміналa, што адначасова з Дзяконскім арыштавалі яе прафесара латыні Адамоніса, якому яна дасылала пасылкі з правізіяй. Потым гэты прафесар згадваў пра Дзяконскага. Ена Брухальскі, які пасля вайны пераехаў у Ізраіль, сведчыў, што Дзяконскі служыў у арміі Андэрса і жыў у Ізраілі. Сын лакея Дзяконскага згадваў, што пан марыў пераехаць у Бразілію і хацеў узяць з сабой некаторых адданых людзей [27, с. 2].

Жонка Дзяконскага Соф'я пераехала ў Польшчу. Апошнія гады свайго жыцця яна правяла ў в. Бук каля Познані, дзе і памерла ў 1979 годзе. Будынак памешчыцкага дома пасля вайны быў часткова перабудаваны і страціў свой першапачатковы выгляд. Да таго ж на тэрыторыі парка былі ўзведзены іншыя карпусы бальніцы, якія змянілі выгляд сядзібы. Лёс сядзібы ў Магілёўцах быў значна шчаслівейшы, чым лёсы большасці шляхецкіх сядзіб.

**Заключэнне.** У 70-я – канцы 80-х гадоў XIX стагоддзя маёнтак Магілёўцы ў Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні перайшоў ад Сяргея і Казіміра Быхаўцаў да іх пляменніка Казіміра Дзяконскага, сына іх сястры Юліі. З прычыны адсутнасці дзяцей у Казіміра, пасля яго смерці маёнтак быў перададзены ў валоданне далёкаму родзічу, Альбіну-Міхалу Дзяконскаму. Альбін-Міхал стаў апошнім гаспадаром гэтага маёнтка. У верасні 1939 года ён быў арыштаваны савецкімі ўладамі і памёр у невядомай турме пасля сакавіка 1940 года. Гады існавання савецкай дзяржавы прывялі да разбурэння шляхецкай культурнай спадчыны. Сядзіба Быхаўцаў-Дзяконскіх у Магілёўцах адносіцца да рэдкага прыкладу выкарыстання і захавання пабудоў памешчыцкага маёнтка.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ). – Фонд 1. – Воп. 7. – Спр. 2490. О собрании и сообщении сведений министру государственных имуществ о имениях предполагаемых обложению налогами, 1878 г.
2. Ciszewska, C. Gawęda o tym, co było / C. Ciszewska. Rękopis // Biblioteka Narodowa, zbiory specjalne. – 1961. – 429 s.
3. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie / R. Aftanazy. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1992. – Tom 2. – 471 s.
4. Федорук, А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А.Т. Федорук. – Минск: БелЭн, 2006. – 576 с.
5. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 413. Запись о передаче помещикам Стрелецкому и Вороновичу во владение фольварков помещика Дзеконского, арендуемого Стрелецким (1889 г.).
6. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 418. Повестка Волковысской уездной дорожной комиссии помещику Дзеконскому об отпуске им лесоматериала на устройство мостов (1904 г.).
7. НГАБ. – Фонд 30. – Воп. 1. – Спр. 140. Материалы по винокуренному заводу № 12 Дзеконского Казимира Евстафиевича в им. Розалин Волковысского уезда (1895 – 1914 гг.).
8. Свод памятинков истории и культуры Белоруссии. Брестская область / под ред. С.В. Марцелев [и др.]. – Минск: БелЭн, 1990. – 424 с.
9. Kapryza, W. Mogilowce / W. Kapryza // Głos znad Niemna. – 1995. – 22 – 29 maja. – S. 4.
10. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 410. Дело об утверждении завещания помещика Дзеконского Казимира жене Дзеконской Стефании.
11. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 624. Соглашение помещицы Дзеконской Стефании с помещиком Дзеконским Альбином о продаже ему им. Могилёвцы.

12. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 619. Запись о наличии инвентарной записи в им. Могилёвцы Волковысского уезда.
13. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 411. Дело о передаче помещику Буйновскому Сигизмунду части наследства помещика Дзеконского Юлиана.
14. НГАБ. – Фонд 398. – Воп. 1. – Спр. 138. Дело по обвинению крестьян д. Гута Чайковских Антона и Леонтия в самовольной ловле рыбы в канавах сенокосного луга помещицы им. Могилёвцы Дзеконьской Стефании (1914 – 1915 гг.).
15. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 626. Дело о реквизиции посевов в им. Могилёвцы Волковысского уезда (1915 г.).
16. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 416. Доверенность помещицы Дзеконской Стефании помещику Дзеконскому Альбину по делу выдачи вознаграждения за реквизицию посевов (1916 г.).
17. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 417. Декларация о нанесении войсками ущерба имуществу помещицы Дзеконской Стефании (1920 г.).
18. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 403. Метрическая запись о бракосочетании помещика Дзеконского Альбина с Малинской Софьей.
19. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Фонд 79. – Воп. 1. – Спр. 1644. Дело об утверждении Деконьского Альбина в правах собственности на недвижимое имущество.
20. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 405. Метрическая запись о смерти помещицы Дзеконской Стефании.
21. НГАБ. – Фонд 1664. – Воп. 1. – Спр. 421. Опись документов помещиков Дзеконских (1926 г.).
22. Roszkowski, W. Gospodarcza rola większej prywatnej własności ziemskiej w Polsce 1918 – 1939 / W. Roszkowski. – Warszawa, 1986. – 431 s.
23. Spis ziemian Rzeczpospolitej Polskiej w roku 1930. Województwo Białostockie / oprac. T. Epsztein, S. Górzyński. – Warszawa: DiG, 1990. – 24 s.
24. Stankiewicz, Z. Poeta Kresów / Z. Stankiewicz // Głos znad Niemna. – 2003. – 14 lutego. – S. 10.
25. Dziekoński, A. Wybór poezji / A. Dziekoński; opracował i wstępem poprzedził Jerzy Poradecki. – Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1985. – 328 s.
26. Терехова, В. Поэт, который не искал славы… / В. Терехова // Заря. – 1997. – 20 ноября. – С. 3.
27. Церахава, В. «У запрэжцы коней у свае Магілёўцы» / В. Церахава // Сельская праўда (Жабінка). – 2002. – 16 жніўня. – С. 2.

*Паступіў 14.04.2009*

**MAHILYOWTSY ESTATE OF THE DZYAKOWSKI LANDLORDS IN 1880 – 1930**

*The article dwells on the history of the Mahilyowtsy estate in the Volkovysk locality (now Brest region, Pruzhany district). For a long time the estate belonged to the Byhawtsy family. In the late 1870-s – early 80-s, after brothers Byhawtsy died childless, Mahilyowtsy moved to their sister's son Kazimir Dzyakonski. On the ground of the unpublished memoirs by Ts. Tsishewkaya, the author analyses the lifestyle of the landlords. We propose the description of the estate that was the centre of the high life of the region. The article dwells on the fate of the last landlords – Stephania and Albin-Mikhal Dzyakonski. New documents stored in the Historical Record Office of Belarus in Grodno and the National Library of Poland were added to the scientific investigation. Camera records presented by the descendants of Dzyakonski are published for the first time.*